# СКРЫПЯЦЬ АЎТАРУЧКІ

ЧАСТА бывалі вы ў гуманітарным корпусе ўніверсітэта? Вам спадабаліся яго шырокія лесвіцы, свежыя аўдыторыі, паркетныя падлогі (дзе, дарэчы, часта бывае насмечана), гістарычны музей, вялікая актавая зала, карцінная галерэя. Але ці ведаеце вы, што ў гэтым жа корпусе апрача галерэі з рэпрадукцыямі сусветна вядомых мастакоў ёсць галерэя шэдэўраў прыкладнога і абстрактнага мастацтва. А малявалі іх студэнты філалагічнага, гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў. Не ведаеце? Ну, дык прабачце, але тады вы не ведаеце ўсёй прыгажосці гэтага будынка і надзвычайных талентаў будучых «вучоных мужоў». Ды і намаляваны гэтыя карціны не на палатне, не на паперы (гэта ўжо старыя метады), а на дрэве... Так, так. На самай звычайнай мэблі. Зайдзіце ў актавую залу і паглядзіце на спінкі крэсел. Якая там прыгажосць! Пазайдросціў бы, напэўна, і сам Леанарда да Вінчы, убачыўшы некаторыя малюнкі. Ёсць тут партрэты прыгожых дзяўчат, пейзажы (пераважна лясныя), скрыпічныя ключы, ноты, зварот да нейкіх «ідыётаў» і «ірадаў цара нябеснага», алфавіты, тонка сплеценыя ініцыялы, арнаменты. Тут і спробы напісання вершаў. Вось старанна выведзена з двухсцішша: «Я Лева Задов, со мной шутить не надо», а побач партрэт цудоўнай дзяўчыны з кароценькай стрыжкай і подпіс «Пані Ірына Казлоўская». Тут і прызнанні ў вечным каханні, бо папера—прабачце, дрэва—можа ўсё вытрымаць, нават хлусню. Дзяўчаты могуць пазнаёміцца з навейшымі модамі, бо тут ёсць і малюнкі элегантных сукенак, паліто і іншых рэчаў.

Лекцыя па гісторыі КПСС у першакурснікаў філфака.. Прыгледзімся, чым заняты студэнты. Вось мілавідная дзяўчына сінім чарнілам любоўна выводзіць толькі тры літары «БІЁ». Скрыпіць ад натугі аўтаручка, з дрэва ляцяць дробненькія апілкі, але дзяўчына, упарта закусіўшы язык, усё ж малюе. Ці то запаў ёй у душу які-небудзь біёлаг—хто ведае?—але яна старанна ўвекавечвае гэтае кароценькае слоўца.

А вось, мусіць, прыклаў руку будучы «блюститель закона»—на спінцы крэсла акуратным каліграфічным почыркам выведзена «Уголовное право». Шкада толькі, што няма нумара артыкула, па якім караецца псаванне дзяржаўнай маёмасці.

Няма магчымасці пералічыць усё. Наведаецеся да нас, пагледзіце самі. Вы яшчэ не тое ўбачыце, шмат аб чым даведаецеся. Напрыклад, аб тым, што большасць студэнтаў, што займаюцца ў корпусе гуманітарных навук,—моцныя, спрытныя, вынослівыя людзі, сапраўдныя спартсмены. Заняткі спортам заключаюцца ў спаборніцтве на колькасць паламаных крэсел. Сапраўды ўсёабдымныя галовы, дзякуючы намаганням якіх прыгожыя крэслы не могуць стаяць без кастылёў.

Ужо колькі разоў гаварылі і пісалі аб гэтым. Ды ўсё не на карысць. І аўтаручкі працягваюць скрыпець. Калі ж гэта скончыцца?

**А. ТРУКШЫНА,**
**студэнтка 1-га курса аддз. журналістыкі.**



ЗІМОВЫ ЛЕС.

Фота В. Анцыферава.

**Вечаслаў КАПЦІЛОВІЧ**

*З ДЗЁННІКА ТУРЫСТА*

# Сярод шумлівых лясоў і азёр

*23 СТУДЗЕНЯ. Нарэшце, мы ў вагоне. Ззаду засталіся ўсе меркаванні, хваляванні і пабягушкі, звязаныя з падрыхтоўкай да пахода. Дэталёва прадуманы і зацверджаны маршрутнай камісіяй план. Выбралі мы найбольш маляўнічы і багаты славутасцямі маршрут, які праходзіць па поўначы нашай рэспублікі, Полацк—Браслаў. Набылі ўсе неабходныя рэчы: прадукты, медыкаменты, кухонныя прылады, прылады для рамонту лыж, компасы, карты і да т. п. Усё гэта акуратна ўпакавана ў рукзакі, якія надзейна занялі месца на верхніх полках.*

*Поезд крануўся. За вокнамі мільгаюць пакгаузы, склады, прыгарадныя збудаванні. Нашы турысты задумаліся: магчыма яны ўспамінаюць аб экзаменах, якія толькі што зданы, магчыма, аб трэніроўках, якія не спыняліся нават у час сесіі, а можа аб былых паходах, у якіх многія з нас ужо ўдзельнічалі.*

*Але ў вагоне немагчыма доўга сядзець у задуменні. Гэта месца, дзе людзі хутка сыходзяцца, знаёмяцца і знаходзяць агульную тэму для размовы. Мы пазнаёміліся з ваеннаслужачымі. Вагон напоўніўся смехам, жартамі.*

*— Давайце спяем,—прапанавала Ніна Песенька, і розныя па вышыні і тэмбру галасы падхапілі бадзёрую песню. Весела і непрыкметна прыехалі ў Маладзечна. Калі выходзілі з вагона, правадніца нават назвала нас артыстамі, відаць, таму, што некаторыя артысты пяюць нікчэмна, падобна нам.*

*У зале чакання свабодных месц не было. Прыйшлося абівуачыцца на падлозе. Тут наша васьмёрка і правяла сваю першую паходную вячэру.*

*Гадзіна ночы. Мы селі на поезд, які ідзе ў Полацк. Усе паваліся на полкі і хутка пад манатонны перастук колаў заснулі.*

*24 СТУДЗЕНЯ. На досвітку былі ў Полацку, самым старажытным горадзе Беларусі. Палачане хутка будуць адзначаць 1100-годдзе свайго горада. Тут дружалюбна зжыліся помнікі старажытнай архітэктуры і зодчаства з прыгожымі сучаснымі будынкамі. З вялікай цікавасцю мы агледзелі Сафійскі сабор і храм Еўфрасініі Полацкай, якія адносяцца да XII стагоддзя, кадэцкі корпус, які таксама прадстаўляе сабой слаўную старонку ў гісторыі беларускай архітэктуры.*

*Шмат у Полацку і гістарычных мясцін. Тут бываў рускі цар Іван Грозны. Для абароны горада ад Рэчы Паспалітай ён пабудаваў земляны вал, рэшткі якога захаваліся да нашага часу. Быў у Полацку і Пётр Першы. Захаваўся домік, у якім ён застанаўліваўся. Здзіўляюць сваёй прыгажосцю кварталы, якія забудаваны ў пасляваенны час, у асноўным, чатырох-пяціпавярховымі дамамі. Незабыўнае ўражанне пакідаюць архітэктурныя ансамблі, скверы, вуліцы, магутная Дзвіна, якая дзеліць горад на дзве часткі, і велічныя масты над ёй.*

*У райкоме камсамола нам параілі наведаць завод шкловалакна. Там нас сустрэлі ветліва. Сакратар завадскога камітэта камсамола Віктар Барзоў расказаў аб гісторыі завода, аб выпускаемай прадукцыі. Узнік завод тры гады таму назад, цяпер значна расшыран. На ім працуе, у асноўным, моладзь, многія рабочыя займаюцца рознымі відамі спорта, ёсць тут і секцыя турызма-альпінізма. А турыст турыста заўсёды рады сустрэць. Завязалася ажыўленая размова, затым мы агледзелі цэхі, якія абсталяваны па апошняму слову тэхнікі, прасачылі ўвесь працэс ператварэння шкла ў валакно, а затым у шоўк. Рабочыя па-сяброўску сустракалі нас, ахвотна паказвалі і расказвалі пра сваю работу. Калектыў завода змагаецца за права называцца прадпрыемствам камуністычнай прац[illegible]*

*Мы цёпла развіталіся з майстрамі штучнага шоўку. На памяць нам яны падарылі ўзоры сваёй прадукцыі.*

*Апоўдні мы ўзялі курс на «Нафтабуд». Снегу тут мала, недастаткова, каб ісці на лыжах, і нам прыйшлося аддаць даніну таком[illegible] [illegible]аражытнаму віду спорту, як[illegible]ба на доўгія дыстанцыі.*

*Яшчэ задоўга да прыбліжэння будоўлі адчуваецца пульс яе. Па дарозе раз-по-раз снуюць машыны з цэментам, жалезабетоннымі канструкцыямі, цэглай, сталярнымі вырабамі. Апошнія кіламетры перад будоўляй. Мы чакалі ўбачыць звычайны пасёлак, які пачаў будавацца два гады таму назад, з памяшканнямі барачнага тыпу, але тое, што адкрылася перад намі, ні за што не было падобна на пасёлак. Гэта быў горад з чатырохпавярховымі будынкамі, шырокімі вуліцамі і маладымі саджанцамі. Нават не верыцца, што ўсе гэта вырасла за два гады.*

*Сустрэлі нас будаўнікі гасцінна. У першую чаргу мы адчулі аператыўнасць журналістаў мясцовай шматтыражнай газеты «Знамя новостройки». Яны першымі сустрэлі нас, запрасілі ў рэдакцыю і ўзялі інтэрв'ю.*

*Вечарам мы пайшлі на сустрэчу ў школу рабочай моладзі. Гэта была вельмі цёплая і сяброўская сустрэча. Зала была перапоўнена. Мы расказалі аб сваім універсітэце, занятках і ўмовах паступлення ў яго, заклікалі рабочых паступаць да нас. Будаўнікі падзяліліся з намі думкамі аб сваёй рабоце, планах, будучым будоўлі. Хтосьці папрасіў аўтаграф, пайшлі ў ход аўтаручкі, пачалі пісаць адзін другому гарачыя пажаданні.*

*Пасля доўга гулялі па пасёлку (пакуль так называецца гарадок нафтабудаўнікоў). Цудоўнае месца! Унізе ляжыць скаваная лёдам прыгажуня-Дзвіна, а за пасёлкам шуміць дрымучы лес. Перад намі прасторныя вуліцы, асветленыя электрычнымі агнямі, паабапал высокія дамы, адкуль даносіцца музыка, смех, песні. Асабліва людна ля кінатэатра. Рабочыя спяшаюцца на сеанс. Аднак не пустынна і на самых акраінах паселка. Тут узводзяцца новыя дамы. Праца не спыняецца нават ноччу. Ля магазінаў завіхаюцца маладыя гаспадыні, халасцякі бягуць у сталовую. Пасёлак жыве, бурліць. Мы ходзім і любуемся яго прасторнымі, удала спланаванымі кварталамі.*

*— Тут гуляць прыемней, чым у Мінску на праспекце,—у захапленні зазначае Мікола Скарабагатай.*

**(Працяг будзе)**

# КАЛІ ІМКНЕШСЯ ДА МЭТЫ

**Паступіць на аддзяленне журналістыкі БДУ было запаветнай марай Сашы Дыско. Доўгімі зімовымі вечарамі праседжваў ён над падручнікамі па літаратуры, гісторыі, зубрыў цяжкія нямецкія спражэнні. І вось прыйшло лета 1957 года. Яно прынесла столькі радасных падзей, а галоўнае—у руках атэстат сталасці, сапраўдная пуцёўка ў жыццё. Аляксандр упакаваў свае рэчы, развітаўся з роднымі і паехаў у сталіцу.**

**Прайшла цяжкая пара экзаменаў, улягліся хваляванні. Аляксандр быў залічан ва ўніверсітэт. З захапленнем акунуўся юнак у бурлівае студэнцкае жыццё. У ім умацоўвалася ўсвядамленне таго, што ён не памыліўся ў выбары сваёй будучай прафесіі. Хутка прайшоў час. Аляксандр паспяхова здаў экзамены за першы курс і перайшоў на другі. Але тут прыйшлося перапыніць вучобу—Дыско прызвалі ў рады Савецкай Арміі.**

**...Камандзірскі кацер адваліў ад борта стаяўшага на рэйдзе крэйсера і, рассякаючы носам высокую хвалю неспакойнага мора, узяў курс на прычал. Праз некалькі хвілін кацер адшвартаваўся паміж двума тральшчыкамі. Першым на прычал сышоў высокі капітан 1-га ранга, а за ім—рулявы кацера с жоўтай палоскай старшага матроса на пагонах бушлата. Умацаваўшы швартовы, рулявы зноў прыгнуў на палубу кацера, пакапаўшыся ў маторы і выцершы старанна рукі, накіраваўся на бераг.**

**— Ну, як, Дыско, на сёння скончыў сваю працу?—запытаўся часавы, правяраючы пропуск. Аляксандр моўчкі кіўнуў і пайшоў далей.**

**— Пастой, Саша, не спяшайся. Тут цябе таварыш мічман са штаба чакае.**

**Да Сашы падыйшоў пажылы мужчына.**

**—Вы старшы матрос Дыско?**

**— Я.**

**— Не «я», а «так точна», што вас не вучылі? Вось атрымайце выпіску з загада.**

**Так Аляксандр стаў наборшчыкам у друкарні флоцкай газеты. Праз год ён атрымаў спецыяльнасць лінатыпіста. Праца ў друкарні раскрыла яму ўсе «сакрэты» выпуску газеты, і гэта прынесла яму вялікую карысць, бо ён ведаў, што пасля службы абавязкова вернецца да вучобы. Чатыры гады—тэрмін службы на флоце, але Саша поўнасцю не даслужыў: Савецкі Урад скараціў Узброеныя Сілы.**

**— Ідзі, Дыско, заканчвай сваю вучобу,—сказаў на развітанне зампаліт, моцна паціскаючы яму руку.**

**Вярнуўшыся дамоў, Саша зноў прыйшоў ва ўніверсітэт. Тут ён сустрэў сваіх новых сяброў, і мы пазналі і палюбілі яго — сціплага, чулага, разумнага таварыша. Нялёгка прыходзіцца яму—многае ўжо забыта, шмат якія прадметы прыйшлося даздаваць. Але быў матрос не паў духам. У яго ёсць добры памочнік—спакойная вера ў свае сілы.**

**Ні пуха табе, ні пяра, Аляксандр!**

**В. ЗЕВІН,**
**студэнт ІІ-га курса аддз. журналістыкі завочнага факультэта.**

# ТРЭНІРУЮЦЦА ГІМНАСТЫ

**... Мяккія гукі раяля плывуць па залі. Некалькі дзяўчат пад музыку выконваюць вольныя практыкаванні. Стройныя фігуркі кружацца, плаўна згінаюцца, і вось, паслухмяныя мелодыі, зрываюцца ў складаную і хуткую серыю рэзкіх пераваротаў. І зноў плаўныя, прыгожыя рухі, звязаныя з рытмам і мелодыяй музыкі. Гледзячы на іх, мімаволі прыгадваеш балет...**

**Група юнакоў сабралася ля паралельных бруссяў. Усе хлопцы, як кажуць, «на падбор»—стройныя, падцягнутыя. З імі ёсць і «дзядзька Чарнамор»—гэта майстар спорту Анатоль Сяргеевіч Ішчанка. Ён трэнер каманды гімнастаў універсітэта.**

**— Каманда ў нас добрая,—гаворыць Анатоль Сяргеевіч.—Большасць рэбят пачалі займацца гімнастыкай толькі ва ўніверсітэце, але ўжо дабіліся вялікіх поспехаў. Нашы лепшыя гімнасткі Грэта Лаппо і Надзя Дзенісенка адпрацоўваюць практыкаванні праграмы майстроў. Паспяхова трэніруюцца першаразраднік Валерый Іваноў, другаразраднік Валерый Касічаў і Андрэў Кожынаў. Ды і ўсе астатнія не адстаюць!**

**Цяпер каманда гімнастаў універсітэта рыхтуецца да першынства горада Мінска сярод вышэйшых навучальных устаноў, якое адбудзецца ў пачатку красавіка. Хочацца пажадаць гімнастам вялікіх поспехаў у цяжкай спартыўнай барацьбе. І, гледзячы як старанна адпрацоўваюць гімнасты кожны рух, верыцца, што поспехі абавязкова будуць.**

**В. ЗЕЛЬВІНСКІ.**

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:
**Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; Тэлефон: 2-07-19.**
**Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна.**

АТ 06303. Зак. 609